# Адкрыты Рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва «Час танцаваць» пройдзе ў Мінску

31.03.2022 12:43

9 красавіка Рэспубліканскі культурна-асветніцкі цэнтр прадставіць маштабны праект сацыяльнага значэння — адкрыты конкурс харэаграфічнага мастацтва «ЧАС ТАНЦАВАЦЬ».



Конкурс пройдзе пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі, міністэрстваў адукацыі і інфармацыі краіны, Нацыянальнага прэс-цэнтра Рэспублікі Беларусь.
Генеральным партнёрам гэтага рэспубліканскага конкурсу харэаграфічнага мастацтва ў год свайго стагоддзя выступіў «Беларусбанк». Найбуйнейшы банк заўсёды актыўна падтрымлівае развіццё культуры і мастацтва, а таксама таленавітую моладзь нашай краіны.
Да ўдзелу ў конкурсе запрошаны сольныя выканаўцы, ансамблі любых формаў, танцавальныя калектывы навучальных устаноў, устаноў культуры і мастацтва краіны, а таксама іншыя самастойныя калектывы і выканаўцы.
Мяркуецца, што на конкурсную сцэну выйдуць больш за 700 выканаўцаў з усіх рэгіёнаў нашай краіны. Прыедуць Узорныя і Заслужаныя калектывы.
Маштабны сацыяльны праект вызначыць лепшых у самых розных катэгорыях — ад класічнай харэаграфіі да вулічных кірункаў.
Пераможцы вызначацца па кожным кірунку, у кожнай намінацыі і ў кожнай узроставай групе. Па выніках конкурсу будуць прысвойвацца наступныя званні: Гран-пры (вызначаецца з ліку пераможцаў у асобных намінацыях шляхам закрытага галасавання журы); лаўрэат 1-й, 2-й, 3-й ступеняў; удзельнік.
Па выніках конкурсу ў адпаведнасці з прысвоеным званнем усе ўдзельнікі конкурснай праграмы ўзнагароджваюцца дыпломамі. Лаўрэатам будуць уручаны кубкі і памятныя сувеніры. Уладальніку Гран-Пры будзе ўручаны дыплом, кубак, грашовы прыз і памятны сувенір.
У праграме конкурсу запланавана насычаная адукацыйная праграма, што ўключае ў сябе правядзенне майстар-класаў асноўнымі харэографамі Беларусі.
Склад прафесійнага журы сфарміраваны арганізатарамі конкурсу з ліку прафесійных харэографаў па ўсіх заяўленых кірунках, прадстаўнікоў арганізатара, партнёраў конкурсу. Гэта мастацтвазнаўцы, прафесійныя балетмайстры, харэографы-пастаноўшчыкі, народныя артысты Беларусі, мастацкія кіраўнікі і педагогі. **Старшынёй журы конкурсу выступіць загадчыца кафедры харэаграфіі, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат навук, член экспертнага савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва Святлана Гуткоўская.**
Улічваючы шырокі ахоп удзельнікаў розных узроставых груп (ад 3 гадоў і старэйшыя) па дзевяці харэаграфічных кірунках, заснавальнікі выяўляюць упэўненасць, што конкурс «ЧАС ТАНЦАВАЦЬ» стане найбуйнейшым форумам харэаграфічнага мастацтва Рэспублікі Беларусь сярод аматарскіх і прафесійных калектываў.

Надзея ЗУЕВА